ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
07.06.2023 № 226

# ПАЛАЖЭННЕ
аб экспертным савеце па пытаннях
аднясення музейных прадметаў,
уключаных у Музейны фонд
Рэспублікі Беларусь, да асабліва
каштоўных музейных прадметаў

1. Экспертны савет па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў (далей – экспертны савет) ствараецца пры дзяржаўнай установе «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь» у мэтах ўзгаднення рашэння аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў (далей – музейных прадметаў), за выключэннем музейных прадметаў, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія адносяцца да асабліва каштоўных музейных прадметаў.

2. У сваёй дзейнасці экспертны савет кіруецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі і сапраўдным Палажэннем.

3. У склад экспертнага савета ўваходзяць прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных музеяў, іншых арганізацый. Экспертны савет узначальвае старшыня, а ў яго адсутнасць – намеснік старшыні экспертнага савета.

Колькасны і персанальны склад экспертнага савета зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры.

4. Арганізацыйныя пытанні работы экспертнага савета забяспечваюцца дзяржаўнай установай «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь».

5. У мэтах узгаднення рашэння аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў, прынятага музеем або юрыдычнай асобай, структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей (далей – музей), музей прадстаўляе ў экспертны савет:

хадайніцтва аб узгадненні рашэння аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў (далей – рашэнне музея);

рашэнне музея ў выглядзе загада па форме згодна з дадаткам;

выпіску з пратаколу пасяджэння фондава-закупачнай камісіі або іншай упаўнаважанай кіраўніком музея камісіі.

6. Экспертны савет у межах сваей кампетэнцыі разглядае

дакументы, прадстаўленыя ў адпаведнасці з пунктам 5 дадзенага Палажэння і прымае рашэнне аб ўзгадненні або адмове ва ўзгадненні рашэння музея. Рашэнне аб адмове прымаецца ў выпадку адсутнасці ў музейных прадметах навуковай, гістарычнай, мемарыльнай, мастацкай і (або) эстэтычнай вартасці.

У выпадку, калі вызначаныя ў рашэнні музея прадметы часткова могуць быць аднесены да асабліва каштоўных музейных прадметаў, экспертны савет адмаўляе ва узгадненні дадзенага рашэння з абгрунтаваннем і ўказвае на неабходнасць ўнясення ў яго змяменняў. Рашэнне аб ўзгадненні або адмове ва ўзгадненні накіроўваецца ў музей у выглядзе выпіскі з пратакола пасяджэння экспертнага савета.

7. Экспертны савет у межах сваей кампетэнцыі кансультуе музеі па пытанях аднясення музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў.

8. Пасяджэнні экспертнага савета праводзяцца па меры неабходнасці.

Пасяджэнні экспертнага савета лічацца правамоцнымі пры наяўнасці не менш дзвюх трэціх ад яго складу. Рашэнні экспертнага савета сапраўдныя, калі яны прыняты большасцю галасоў членаў экспертнага савета, якія прысутнічалі на яго пасяджэнні.

Рашэнні экспертнага савета фіксуюцца ў пратаколе. Пратаколы пасяджэння экспертнага савета складаюцца ў адным экзэмпляры і падпісваюцца ўсімі прысутнымі на дадзеным пасяджэнні членамі экспертнага савета.

Дадатак
да Палажэння аб экспертным савеце па пытаннях аднясення музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, да асабліва каштоўных музейных прадметаў

Форма

(назва арганізацыі)

ЗАГАД

______________ №

Аб аднясенні музейных
прадметаў да асабліва
каштоўных музейных
прадметаў

У адпаведнасці з часткай другой пункта 6 артыкула 176 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, на падставе пратакола пасяджэння

__ ______________________________________________
(указваецца наймение камісіі і музея) _____ №___

ЗАГАДВАЮ:

Аднесці наступныя музейныя прадметы[1], якія захоўваюцца ў музейным фондзе ______________________________
(назва музея)
да асабліва каштоўных музейных прадметаў:

| № п/п | Уліковае абазначэнне музейнага прадмета | Прадметнае імя | Аўтар | Час і месца стварэння, матэрыял, тэхніка | Выява музейнага прадмета |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Кіраўнік музея (арганізацыі,структурным падраздзяленнем якой з'яўляецца музей)

(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

1Пры наяўнасці значнай колькасці музейных прадметау магчыма іх пералік указваць у дадатку да загаду.